


# НА АСНОВЕ ПЕРАЖЫТАГА

**Выйшла з друку новая кніга прозы. Яе аўтар член Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Пяшко (Шчучын). Выданне атрымала назву «Аднакурснікі» *(Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2025)*.**

«У новай кнізе Івана Пяшко «Аднакурснікі» на аснове асабіста перажытага пісьменнік паказаў лёс цэлага пакалення, якое прайшло праз цяжкія выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны і ў нялёгкіх пасляваенных умовах аднаўляла родны край. Аўтар падзяліўся з чытачамі ўсхваляванымі ўспамінамі пра сваё апаленае вайной дзяцінства, пра юнацтва, студэнцтва, пра свае ўзлёты і падзенні, радасць і гора, пра жыццё родных і блізкіх, аднавяскоўцаў, сяброў». */Анатацыя/.*

Змест новай кнігі вядомага ў нашай краіне ветэрана літаратурнага руху, празаіка Івана Рыгоравіча Пяшко – гэта дзве аповесці: «Без бацькі» і «На хвалях лёсу», а таксама нізка эсэ пад агульнай назвай «Аднакурснікі».

У выданні 200 старонак, пераплёт цвёрды. Тыраж 700 экзэмпляраў. *Рэдактары кнігі Н. Ф. Крыцкая; Т. Р. Мартыненка; Н. Г. Шчарбакова. Мастак К. А. Задворны.*

Выпуск новага літаратурна-мастацкага выдання, кнігі члена СПБ, беларускага празаіка з горада Шчучын Івана Пяшко «Аднакурснікі» ажыццёўлены па заказе і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Калі ласка, пытайцеся ў кнігарнях і бібліятэках.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**